| № п/п | Аўтар, назва, кароткая анатацыя | Мова выдан ня | Арыен цір. кошт 1 экз. з НДС, руб. | Арыенці ровачная коль-касць старонак | Вокладка/ ілюстрацыі | **Заказ, коль-касць экз.** |
|---|---|---|---|---|---|---|
| | **ЗБОРЫ ТВОРАЎ, ВЫБРАНЫЯ ТВОРЫ** | | | | | |
| 1 | **Залатая калекцыя беларускай літаратуры ў 50-ці тамах (ЗКБЛ). Т.19**. Аповесць 1920 – 1930-х гадоў / укладанне, прадмова і каментары І. М. Шаладонава. 40 арк. | бел. | 32,00 | 760 | 7Б/ без іл. | |
| 2 | **ЗКБЛ. Т.20.** Паэзія перыяду Вялікай Айчыннай вайны / укладанне, прадмова і каментары А. І. Бельскага. 40 арк. | бел. | 34,00 | 800 | 7Б/ без іл. | |
| 3 | **ЗКБЛ. Т. 21**. Кандрат Крапіва. 40 арк. | бел. | 37,00 | 800 | 7Б/ без іл. | |
| 4 | **Караткевіч У. Збор твораў у 25-ці тамах. Т.19.** Ліставанне. 40 арк. | бел. | 26,00 | 700 | 7Б/ уклейка | |
| 5 | **Караткевіч У. Збор твораў у 25-ці тамах. Т.20.** Малюнкі. 40 арк. | бел. | 26,00 | 700 | 7Б/ уклейка | |
| 6 | **Брыль Я. Збор твораў у 10-ці тамах. Т.5.** Раман "Птушкі і гнёзды". 25 арк | бел. | 35,00 | 450 | 7Б/ уклейка | |
| 7 | **Брыль Я. Збор твораў у 10-ці тамах.Т.6.** Лірычныя мініяцюры. 40 арк. | бел. | 45,00 | 700 | 7Б/ уклейка | |
| 8 | **Максім Танк. Выбраныя творы, успаміны, фотаздымкі.** 20 арк. | бел. | 29,00 | 300 | 7Б/ ілюстрацыі | |
| | **АРЫГІНАЛЬНАЯ МАСТАЦКАЯ ЛІТАРАТУРА** | | | | | |
| | ***Да 75-годдзя Перамогі*** | | | | | |
| 9 | **Адамович А. Сыновья уходят в бой.** Роман. 25 л. Вторая часть дилогии о белорусских партизанах, начатая в романе «Война под крышами», рассказывает о том, как сыновья Анны Корзун в годы второй мировой войны стали партизанами и участвовали в операциях по освобождению Беларуси. Продолжая главное дело своей жизни - служение Родине и борьбу против фашизма - они уходят на фронт, чтобы там, на передовой, защищать страну, каждая пядь которой- их родной дом. Эта простая женщина и ее сыновья и есть та легендарная мощь, которая сокрушила фашистов силой своего духа. | рус. | 44,00 | 500 | 7Б/ иллюстр. | |
| | **ПРОЗА. ПАЭЗІЯ** | | | | | |
| 10 | **Бутэвіч А. Распасажаны дом. Хутарская рэфлексія.** Аповесці. 15 арк**.** Ці здольны чалавек супрацiўляцца абставінам? Ці хапае духоўнай і фізічнай сілы, настойлівасці і жыццёвай мудрасці перайначыць іх на сваю карысць? Ці можа зразумець, што адбываецца, калі ўлада – панская альбо свая, рабоча-сялянская дэкларуе адно, а на практыцы робіць зусім іншае? Дзе чалавек больш адзінокі – на бязлюдным хутары, ці ў цесным ад людскіх локцяў горадзе? Гэтым жывуць героі кнігі. Аповесць "Апошняе ігрышча" – пра жыхароў хутара Язавец, што на Нясвіжчыне ў былой Заходняй Беларусі. Яны яшчэ не ведаюць, што чакае іх пасля 17 верасня 1939 года, калі Савецкая Армія сваім вызваленчым паходам з'яднае беларускія землі ў адну дзяржаву. Не здагадваюцца, як складзецца іхні лёс пасля "добраахвотнага" ўступлення ў калгас і такога ж "добраахвотнага" перасялення з хутара. А таму жывуць сваім звычайным жыццём, насычаным і сапраўднай чалавечай радасцю, і пакутлівымі пошукамі сябе ў гэтым разбэрсаным свеце. Да знямогі шчыруюць на полі, па-сапраўднаму кахаюць. Мрояць пра неверагоднае, весяляцца напоўніцу, сварацца па завядзёнцы. А што, хіба лягчэй кінуць абжыты хутар, разваліць неверагоднымі высілкамі ўпарадкаваную хату, назаўсёды развітацца з хутарской вольнасцю і ехаць невядома куды? Бо паступіла каманда – ссяляцца з хутароў. Пра гэта аповесць "Распасажаны дом, або Хутарская вольніца". | бел. | 25,00 | 300 | 7Б/ без іл. | |
| 11 | **Вераснёвыя ночы.** Беларускае апавяданне пра каханне**.** 15 арк. "Вераснёвыя ночы" – своеасаблівая анталогія тэмы кахання ў беларускай прозе за апошняе стагоддзе. Як кахалі нашы бацькі, дзяды і прадзеды, як змяніліся за гэты час у грамадстве адносіны да праяўлення гэтага інтымнага пачуцця? Лепшыя апавяданні Якуба Коласа, Кузьмы Чорнага, Міхася Зарэцкага, Івана Мележа, Івана Шамякіна, Івана Навуменкі, Анатоля Кудраўца, Вячаслава Адамчыка, Івана Чыгрынава, Аляксея Дударава, Андрэя Федарэнкі, Алены Брава, Валерыя Гапеева, а таксама сучасных маладых беларускіх празаікаў даюць адказы на падобныя пытанні на прыкладзе гісторый, напісаных цікава, запамінальна і на, безумоўна, на высокім мастацкім узроўні**.** | бел. | 23,00 | 270 | 7Б/ без іл. | |
| 12 | **Гапееў В. "Зніч ваўкалака".** Прыгодніцкая аповесць для | бел. | 16,00 | 180 | 7Б/ | |

| | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|
| | падлеткаў. 10 арк. Над расказамі бабулек пра ваўкалака ці чукапабру, якія завяліся ў іх мясцовасці ды душаць курэй, гусей і нават малых цялят, можна пасмейвацца да той пары, пакуль не здараецца страшнае: знікае дзяўчына, удзельніца этнаграфічнай экспедыцыі. Чацвярым сябрам трэба не толькі знайсці ахвяру невядомага звера, але адкрыць старажытную таямніцу і пасля вырашыць: што рабіць з іх знойдзеным скарбам? | | | | без іл. | |
| 13 | **Ждан-Пушкин А. Не погибнет со мной.** Роман. 16 л. Роман о жизни известного революционера и ученого, изобретателя Николая Ивановича Кибальчича. | рус. | 24,00 | 300 | 7Б/ без ил. | |
| 14 | **Конеў Я. Новыя палескія рабінзоны.** Аповесці. 15 арк. Героі аповесці «Новыя палескія рабінзоны» – нашы сучаснікі падлеткі Віктар, Мірон і Юлька. У час вандроўкі на лодцы сярод балот у час павадка яны церпяць караблекрушэнне і трапляюць на востраў, дзе выжываюць, як умеюць. Яны не ведаюць, што ў часы Вялікай Айчыннай вайны на выспе базаваўся штаб партызанскага злучэння, і цяпер туды кіруюць «чорныя археолагі», каб выкапаць каштоўныя рарытэты…<br>Дзеянне твораў «Нёманскі шлях Андрэя Станкевіча», «Андрэй Станкевіч і Таемнае мастацтва» і «Суддзя Станкевіч і вагі Феміды» прысвечана жыццё славутага следчага XVI стагоддзя...<br>Тэма аповесці «Здані Гарадніцы» – жыццё і страсці артыстаў правінцыйнага тэатра на фоне гістарычных зменаў у Заходняй Беларусі ў 20-я – 40-я гады XX стагоддзя. Змяняліся ўлады ў Наднямонні, але нязменным заставалася пачуццё непрыкметнага статыста Пётры Куцыёнка да прымадонны тэатра Апалоніі Дарэўскай. Каханне дапаможа ім выжыць і пакараць высокапастаўленага нацыста…<br>Аповесць «Нямігі берагі» прысвечана векапомным падзеям мінскай гісторыі. Розныя нягоды зведаюць героі твора. Князь Рагвалод у 947-м разгроміць племя няміжан і пабудуе пагост на месцы іх гарадзішча. Князь Глеб будзе біцца з кіяўлянамі ў сакавіку 1067-га. Князь Барыс абароніць горад ад татарскай навалай у 1505-м. Афіцэр СС Аленштайн будзе кіраваць археалагічнымі раскопкамі ў акупаваным Мінску ў 1943-м. Юны мінчанін Зміцер задумае самагубства за гадзіну да трагедыі ў маі 1999-га... Кожны з іх сутыкнецца з праклёнам, кінутым тысячу гадоў таму ўладальніцай неміжан, і здзейсніць свой усвядомлены выбар. | бел. | 28,00 | 280 | 7Б/ без іл. | |
| 15 | **Казека А. Песня роднай зямлі.** Вершы. 5 арк. | бел. | 13,00 | 110 | 7Б/ без іл. | |
| 16 | **Калуженина Л. Когда смеется солнце.** Повести и рассказы. 9 л. Сборник рассказов и повестей Ларисы Калужениной, охватывает широкий круг тем, как исторических, так и современных. Главное для нее — поиск настоящего, родного, своих корней. Проза жизни, проза быта превращается в тонкое, часто поэтическое и всегда психологически достоверное полотно, в увлекательное повествование с ярким, неожиданным сюжетом. Разнообразны и герои рассказов: от руководителей предприятий, бизнесменов, журналистов, писателей и художников, до тех, кого принято называть «простыми людьми», наших современников. Их судьбы всегда вызывают интерес и сочувствие — редкое качество для современной прозы. А когда автор говорит о прошлом, то читатель всегда ощущает реальность зображаемой жизни. Не «судьбы на фоне истории», а отражение героев всей полноты времени. | рус. | 25,00 | 180 | 7Б/ без ил. | |
| 17 | **Караткевіч У. Матчына душа**. Факсімільнае выданне. 3 арк. | бел. | 10,00 | 72 | 7Б/ без іл. | |
| 18 | **Константинова Н. Приступая к жизни.** 10 л. Любовь и другие отношения, самоутверждение, развитие личности… Все это переживают герои психологической прозы Натальи Константиновой. Причем, как и в реальной жизни, развитие не всегда происходит в положительную сторону. Ведь в современном мире так много противоречий и соблазнов, а в душе – переживаний и драм. Поэтому занимательность событий обеспечена. Тем более что во многих рассказах появляются фантастические элементы. Они показывают устройство мира, природу таланта, возможность улучшить судьбу или, наоборот, приводят к полному краху устремлений. Но надежда всегда остается… | рус. | 20,00 | 200 | 7Б/ без ил. | |
| 19 | **Лашук Т. Молодой Витовт.** Повести. 7 л. Первая повесть посвящена юным годам одного из самых известных правителей земли белорусской – Витовта Великого. Борьба за власть и коварные интриги, любовь и долг, честь и предательство: читателя ждет погружение в бурную атмосферу четырнадцатого столетия. Когда крестоносцы огнем и мечом «крестят» родную землю… Когда остается лишь вера в самого себя, и впереди ждет великая победа при Грюнвальде… Вторая повесть «Экзамен» рассказывает о итальянских приключениях Франциска Скорины в Падуе. Что случается, когда сама жизнь предлагает сдать сложный экзамен на | рус. | 22,00 | 130 | 7Б/ без ил. | |

| | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|
| | выбор своего пути, и в чем заключается истинное предназначение человека. | | | | | |
| 20 | **Марчук Г. Мокры снег**. Раман. 10 арк. | бел. | 16,00 | 220 | 7Б/ без іл. | |
| 21 | **Святая птушка.** Беларускае апавяданне пра жывёл. 15 арк. У зборнік “Святая птушка” ўвайшлі лепшыя беларускія апавяданні пра жывёл, напісаныя ў XX — XXI стагоддзях. Сярод аўтараў – Якуб Колас, Міхась Лынькоў, Янка Брыль, Уладзмір Караткевіч, Барыс Сачанка, Анатоль Кудравец, Іван Пташнікаў, Аляксей Дудараў, а таксама сучасныя маладыя беларускія празаікі. | бел. | 17,00 | 300 | 7Б/ без. іл. | |
| 22 | **Палеес Л. Колыбельная для слов.** Стихи. 5 л. В книгу вошли избранные произведнения из предыдущих книг. Стихи о любви, о жизни. | рус. | 14,00 | 110 | 7Б/ без ил. | |
| 23 | **Першацвет.** Выпуск 4. Вершы і проза маладых літаратараў. 10 арк. Зборнік твораў пераможцаў рэспубліканскага конкурсу маладых літаратараў, арганізатарамі якога з’яўляюцца Міністэрства інфармацыі Рэспублікі Беларусь, РВУ “Выдавецкі дом “Звязда” і выдавецтва “Мастацкая літаратура”. | бел. | 16,00 | 180 | мяккая вокл./ без іл. | |
| 24 | **Разанаў А. Версэты.** 10 арк. | бел. | 12,00 | 400 | 7Б/ без. іл. | |
| 25 | **Федарэнка А. Жэтон на метро.** Раман. 10 арк. Новы раман Андрэя Федарэнкі “Жэтон на метро” – псіхалагічны дэтэктыў, які знешне нібыта працягвае прыгодніцкую тэму двух яго папярэдніх кніг, “Афганскай шкатулкі” і “Шчарбатага талера” (паводле апошняга на “Беларусьфільме” зняты тэлефізійны міні-серыял), толькі разлічаны не на падлеткаву, а на дарослую чытацкую аўдыторыю. У межах крымінальнай гісторыі арыгінальна разгортваецца вечны сюжэт злачынства і пакарання. | бел. | 13,00 | 220 | 7Б/ без. іл. | |
| 26 | **Хадановіч А. Плакалі, знаем!** Новыя і выбраныя вершы. 8 арк. | бел. | 24,00 | 180 | 7Б/ без. іл. | |
| 27 | **Чарказян Г. Стрэл у горах.** Проза. 15 арк. | бел. | 20,00 | 330 | 7Б/ без іл. | |
| 28 | **Шніп В. Белае, чорнае і залатое.** Вершы. 10 арк. У 2020 годзе Віктару Шніпу—60. Але гэтая кніга-- не выбарнае. У яе ўвайшлі цалкам новыя творы. Кніга складаецца з чатырох раздзелаў. У першым-- вершы пра гісторыю Беларусі, пра людзей, якія сталі нашым гонарам (Скарына, Купала, Колас, Багдановіч, Караткевіч і інш.). У другім— вершы пра наш сённяшні дзень і нас у гэтым хуткаплынным часе. У трэцім— белыя філасоўскія вершы. У чацвёртым— трохрадкоўі (хоку). І ўсё ж, пра што кніга? Пра тое, што было, што ёсць і што будзе. Белае— гэта чыстая папера, зіма, кужаль… Чорнае-- гэта зямля, ноч, вуголле... Залатое— гэта спелае збожжа, зоры, пясок… У белым ёсць чорнае, а ў чорным ёсць белае, і ўсё гэта знітавана залатым… | бел. | 22,00 | 220 | 7Б/ без іл. | |
| ***СЕРЫЯ “Бібліятэка гістарычнай прозы”*** Захапляльныя сюжэты і найлепшыя беларускія аўтары, знакавыя для нашай гісторыі падзеі і вядомыя гістарычныя асобы, войны і любоўныя інтрыгі… Усё гэта ў новай выдавецкай серыі, мэта якой даць панарамны малюнак нашай багатай мінуўшчыны. | | | | | | |
| 29 | **Дайнека Л. Меч князя Вячкі.** 16 арк. Прыгодніцкі раман Леаніда Дайнекі мае гістарычную аснову. Гэта— гераічная барацьба гараджан старажытнага Полацка з тэўтонскімі рыцарамі-крыжаносцамі. Нягледзячы на тое, што падзеі рамана адбываюцца ў XIII стагоддзі, яго тэматыка вельмі актуальная.Твор прасякнуты ідэяй аб неабходнасці яднання славянскіх народаў, а таксама іх бліжэйшых суседзяў-літоўцаў, латышоў, эстонцаў, для таго, каб процістаяць ворагам. | бел. | 21,00 | 360 | 7Б/ без іл. | |
| 30 | **Тарасаў К. Пагоня на Грунвальд.** 17 арк. Гаворачы пра “Пагоню на Грунвальд”, многія праводзяць паралелі з “Крыжакамі” Сянкевіча. У адрозьненні ад польскага шэдэўра тутэйшыя героі гінуць, і фінал тут трагічны. Беларускае ўспрыманне? Ці наступны крок? Калі людзям напачатку трэ было нагадаць, што ў іх наагул была гісторыя, то цяпер можна пайсці й далей ад “чыстага рамантызму”. У “Пагоні”, адной з вяршыняў нашае гістарычнае прозы, упершыню ў беларускай літаратуры многія тагачасныя героі паўстаюць не схэматычнымі пэрсанажамі, а жывымі людзьмі. Упершыню чытач можа зразумець іх, людзей, а не квадрат з радкоў у энцыкляпэдыі. То чытай, а як чытаў калісь – перачытвай! | бел. | 22,00 | 380 | 7Б/ без іл. | |
| 31 | **Чаропка В. Храм без Бога.** Раман. 15 арк. | бел. | 20,00 | 340 | 7Б/ | |

| | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|
| | У творы адлюстроўваюцца гістарычныя падзеі мінулага Беларусі пачатку XVI стагоддзя: набегі крымскіх татар, аблога імі Слуцка, перамога літоўска-беларускіх войск над татарамі пад Клецкам, паўстанве беларускай шляхты на чале князя Глінскага супраць караля Жыгмонта. У цэнтры рамана вобраз воіна слуцкай дружыны Мацея Кузьмініча, які ў пагоні за асабістаю выгадаю становіцца на шлях пагодніцтва і злачынства, здраджвае сваім таварышам, ідзе супраць народа. Разам з прыдуманымі героямі ў рамане дзейнічаюць і рэальныя гістарычныя асобы: кароль Польшчы Аляксандр, маршалак Міхайла Глінскі, слуцкая княгіня Анастасія і іншыя. | | | | без іл. | |
| *Серыя "Беларуская проза ХХ стагоддзя"* | | | | | | |
| 32 | **Далідовіч Г. Жар кахання.** Апавяданні пра жанчын. 20 арк.<br>Кніга ўжо знаёмых і новых апавяданняў «Жар кахання» Генрыха Далідовіча – яго пошукі сродкамі мастацкага слова разабрацца ў тым, што молада, парывіста, моцна хвалюе сэрца, высакародзіць душу Яго і Яе, узвышае чалавечае ў Чалавеку. А часамі, на жаль, у няпростых абставінах ці па нейчай асабістай віне прыносіць і нялёгкія перажыванні, а то і боль. | бел. | 37,00 | 400 | 7Б/<br>без іл. | |
| *Серыя "Беларуская паэзія ХХ стагоддзя"* | | | | | | |
| 33 | **Кастусь Кірэенка. Выбраныя вершы.** 10 арк. | бел. | 23,00 | 220 | 7Б/<br>без іл. | |
| *Серыя "Беларуская проза ХХI стагоддзя"* | | | | | | |
| 34 | **Карамазаў В. Брат мой.** Аповесці. 26 арк.<br>"Брат мой" – кніга пра славутых беларускіх мастакоў Вітольда Бялыніцкага-Бірулю, Станіслава Жукоўскага, Фердынада Рушчыца, Антона Бархаткова, Гаўрылу Вашчанку, Анатоля Бараноўскага. Усе яны прыроднікі, пейзажысты. Кожная аповесць дае ўрокі жыцця ў прыродзе, глыбокага разумення і адчування яе красы, яе духоўных скарбаў. | бел. | 30,00 | 500 | 7Б/<br>без іл. | |
| *Серыя "Напісанае застанецца"* | | | | | | |
| 35 | **Іван Шамякін. Сэрца на далоні.** Раман. 25 арк. | бел. | 30,00 | 240 | 7Б/<br>без іл. | |
| *Серыя "Светлыя знакі: паэты Кітая"* | | | | | | |
| 36 | **Лю Баннун (1891--1934) —** активный деятель движения «4 мая», пионер новой китайской поэзии. Боролся за реалистическую литературу, за живой разговорный язык, понятный широкому читателю. Внес ощутимый вклад в разработку новых жанров и форм, рифмы, ритма, нерифмованного стиха, стихотворения в прозе. **3 арк.** | бел. | 8,00 | 64 | мяк.<br>вокл./<br>малюнкі | |
| **ЛЕГЕНДАРНАЯ СЕРЫЯ<br>"Бібліятэка прыгод і фантастыкі" АДНАЎЛЯЕЦЦА!!!!!** | | | | | | |
| 37 | **Баравікова Р. Фальварак каменнай бабы. Аповесць.** 11 арк. | бел. | 16,00 | 220 | 7Б/<br>без іл. | |
| *Серыя "100 вершаў"* | | | | | | |
| 38 | **Броўка П. Вершы.** 7 арк.<br>Сумесны праект выдавецтва і Нацыянальнага мастацкага музея Беларусі. У кнігу ўвайшлі лепшыя вершы Петруся Броўкі. Выданне багата ілюстраванае рэпрадукцыямі карцін вядомых мастакоў Беларусі. | бел. | 20,00 | 130 | 7Б/<br>каляровыя<br>фота | |
| 39 | **Дранько-Майсюк Л. Скарб.** 7 арк.<br>Скарб – не грошы і не багацце, а тая лірычная каштоўнасць, той канечны жыццёвы шлях, якому заўсёды сугучныя журба і весялосць, лагода і хваляванне, таямнічасць і зразумеласць, рухавасць і супакаенне, устойлівыя вобразы і нязвыклая вершаваная мова... Аб тым, што гэта так і што гэта нязменна, сведчыць паэтычная кніга Леаніда Дранько-Майсюка, якой аўтар даў невыпадковую назву "Скарб". | бел. | 20,00 | 130 | 7Б/<br>каляровыя<br>фота | |
| 40 | **Караткевіч У. Беларуская песня.** 7 арк.<br>Сумесны праект выдавецтва і Нацыянальнага мастацкага музея Беларусі. Выданне багата ілюстраванае рэпрадукцыямі карцін вядомых мастакоў Беларусі. | бел. | 20,00 | 130 | 7Б/<br>каляровыя<br>фота | |
| *Серия "Наш современник"* | | | | | | |
| 41 | **Анисенко В. Листая страницы жизни…**18 л.<br>Творческий портрет Заслуженного деятели искусств Беларуси, | рус. | 28,00 | 270 | 7Б/<br>цветные | |

| | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|
| | известного артиста и режиссера Валерия Анисенко. Издание богато иллюстрировано. | | | | вклейки | |
| 42 | **Арлова Т. Алгоритмы удачи.** Рассказы об артистах и режиссерах театров Беларуси. 12 л.<br>“Предлагаю свободную последовательность имен. Это творческие портреты актеров и режиссеров через самые важные пики жизни. Поэтому «Алгоритмы удачи». Оказалось важно разговаривать о серьезном, узнавать мысли о жизни и театре. Из этого сложится история театров в Беларуси, которые я видела с середины XX века до сегодняшних дней.” — пишет автор в предисловии к книге. | рус. | 20,00 | 180 | 7Б/<br>цветные вклейки | |
| | ***Серыя “Жыццё знакамітых людзей Беларусі”*** | | | | | |
| 43 | **Андрэй Макаёнак. Тайна драмы.** 20 арк.<br>Успаміны, партрэты, інтэрв'ю, эсэ, дзённікі, рэпартажы. | бел. | 24,00 | 300 | 7Б/<br>каляровыя уклейкі | |
| 44 | **Аляксандр Кузьмін.** 20 арк.<br>Аляксандр Кузьмін – вядомы беларускі дзяржаўны дзеяч. З 1955 г. – загадчык аддзела прапаганды і агітацыі Мінскага абкома КПБ па ідэалогіі. З 1962 па 1965 г. – член бюро ЦК па кіраўніцтве прамысловасцю, загадчык ідэалагічнага аддзела ЦК КПБ, у 1965–1971 гг. – загадчык аддзела прапаганды і агітацыі ЦК. З лютага 1971 г. па жнівень 1986 г. – член бюро, сакратар ЦК КПБ па ідэалогіі. Дэпутат Вярхоўнага Савета БССР 6–9 і 11 скліканняў. Дэпутат, старшыня Камісіі па справах моладзі Савета Нацыянальнасцей Вярхоўнага Савета СССР 10-га склікання. Унёс значны ўклад у развіццё і ўдасканаленне падрыхтоўкі кадраў адукацыі, навукі і культуры рэспублікі. Шмат зрабіў для умацавання матэрыяльнай базы культуры і мастацтва, увекавечання гераікі ратнай і стваральнай працы. Бюро ЦК КПБ, першы сакратар ЦК П.Машэраў адобрылі ідэю і цалкам падтрымалі прапанову А.Т. Кузьміна аб стварэнні ў працоўных калектывах кніг народнай славы, а таксама аб падрыхтоўцы і выпуску гарадскіх і раённых хронік “Памяць”. | бел. | 24,00 | 300 | 7Б/<br>каляровыя уклейкі | |
| | ***Серыя “Мастакі Беларусі”*** | | | | | |
| 45 | **Альбом «Владимир Товстик. Живопись»**<br>Богато иллюстрированный альбом посвящен творчеству известного белорусского живописца, народного художника Беларуси Владимира Товстика. Издание будет интересно как специалистам, так и широкому кругу читателей/зрителей, интересующихся отечественным искусством, и станет для многих подлинным открытием увлекательного мира современного искусства. Тираж: 500 экземпляров, формат 300 страниц, объем текстовой части – 60 страниц. | рус. | 35,00 | 300 | 7Б/<br>іл.,<br>фота | |
| | ***Серыя “Беларусь мастацкая”*** | | | | | |
| 46 | **Крепак Б. “Юрий Карачун. В зеркале пережитого времни”.** 12. л. | рус. | 30,00 | 250 | 7Б/<br>фото | |
| | **СПАДЧЫНА** | | | | | |
| 47 | **Браніслаў Эпімах-Шыпіла.** 23 арк.<br>Выданне прысвячаецца Б.І. Эпімах-Шыпілу (1859 - 1934) — дзеячу беларускай культуры, выдаўцу, фалькларысту, мовазнаўцу, літаратуразнаўцу. Упершыню ў гісторыямі Беларусі публікуецца ўнікальны рукапісны помнік беларускай літаратуры “Беларуская хрэстаматыя”, якую з вялікай тэксталагічнай руплівасцю і паслядоўнасцю склаў Б.І. Эпімах-Шыпіла ў 1889 - 1931гг. , і дзякуючы якой захаваліся тэксты многіх помнікаў беларускай літаратуры. Таксама ў кнізе змешчана перапіска Эпімах-Шыпілы з паплечнікамі. | бел. | 32,00 | 450 | 7Б/<br>без іл. | |
| 48 | **Максім Багдановіч. Дистихи.** 2 арк<br>Лёс аўтографаў Максіма Багдановіча складаны і заблытаны. Многае было страчана падчас Другой сусветнай вайны. Тым каштоўней робіцца кожная знаходка, напісаная рукой класіка, асабліва калі гэта невядомы раней твор. Верш “Дистихи” Максіма Багдановіча быў нядаўна знойдзены. Але мала знайсці новы тэкст, трэба яшчэ пазнаёміць з ім аматараў літаратуры. І ў гэтым плане ідэя правядзення конкурсу па перакладзе знойдзенага верша была сапраўднай удачай. На конкурс было даслана каля паўтысячы перакладаў. У кнізе Максіма Багдановіча друкуецца ўсяго адзін верш “Дистихи” у перакладзе на беларускую мову, які зрабілі трыццаць пяць аўтараў, што на думку журы з пастаўленай задачай справіліся найлепей за ўсіх. | бел. | 13,00 | 40 | мяк. вокл./<br>без іл. | |
| | **ЛІТАРАТУРАЗНАЎСТВА** | | | | | |

| | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|
| 49 | **Гараднiцкi Я. Чалавек Рэнесансу, прадвеснiк Постмадэрну: мастацкi свет Уладзiмiра Караткевiча.** 20 арк.<br>У кнiзе, прысвечанай 90-гадоваму юбiлею аднаго з самых выбiтных творцаў беларускай лiтаратуры другой паловы XX стагоддзя, разглядаюцца ўсе найбольш прыкметныя складнiкi яго мастацкага свету, якiя ў сваёй сукупнасцi ўтвараюць чароўную i прыцягальную адметнасць твораў гэтага выдатнага майстра. Увага аўтара манаграфii засяроджваецца на вузлавых момантах паэтыкi i асаблiвасцях стылю Уладзiмiра Караткевiча, у якiх увасобiлася маштабнасць яго мастацкага светабачання. У. Караткевiч паўстае як неардынарная творчая асоба з сваiм унiкальным духоўным i мастацкiм светам i, разам з тым, яго творчасць упiсваецца ў лiтаратурны кантэкст свайго часу i iншых мастацкiх эпох. | бел. | 46,00 | 400 | 7Б/ каляровыя iл. | |
| **ВЫДАННI ДЛЯ ДЗЯЦЕЙ I ПАДЛЕТКАЎ** | | | | | | |
| 50 | **Аблажэй А. Як пудзiла марыла стаць птушкай.** 2 арк.<br>Бадай што кожны земляроб неахвотна дзелiцца ўраджаем з няпрошанымi крылатымi нахлебнiкамi, птушкамi. I, каб адстрашыць iх, на полi ставяць пудзiлы. Зрабiць яго проста -- бярэцца старая рыдлёўка, цi дзве палкi крыж-накрыж, патрапаная апранаха ды паношаны капялюш, i стаiць пудзiла, размахвае пад ветрам дзiравымi рукавамi... Але было адно такое незвычайнае пудзiла, якое не толькi не хацела адпуджваць птушак, а само прагнула стаць птушкай! Хто ведае, можа, капялюш, якi быў на iм, раней упрыгожваў галаву нейкага летуценнiка цi паэта? Што з гэтага выйшла i чым усё скончылася, вы даведаецеся, прачытаўшы казку мастака А. Аблажэя. | бел. | 6,00 | 32 | мяк. вокл./ малюнкi | |
| 51 | **Бунта Т. Сад з матылямi.** Аповесць-казка. 5 арк.<br>У адным цудоўным садзе жыве дзяўчынка, якая разумее мову дрэў, кветак, птушак, жукоў, матылёў i iншых садовых насельнiкаў. Яе дом нагадвае казачны церам, ён аздоблены драўлянымi карункамi ў выглядзе дзiўных птушак i раслiн. На ўсiх яго вокнах з белымi аканiцамi растуць прыгожыя кветкi, а ў адным акне гэтыя кветкi – жывыя. Яны трапечуць, б’юцца аб шыбу i час ад часу, калi акно адчыняюць, выпырхiваюць у сад i аказваюцца не кветкамi, а матылямi. Таму цудоўны сад заўсёды поўны дзiўных матылёў.<br>Штораніцу з дома-церама выязджае на вазку дзяўчынка з пышнымi валасамi i ў прыгожай сукенцы. Яна падобная на маленькую прынцэсу, таму ўсе насельнiкi саду так i клiчуць яе – Прынцэса саду. Дзяўчынка аб’язджае на сваiм вазку увесь сад, вiтаецца з яго жыхарамi, выслухоўвае iх навiны i скаргi. Усе насельнiкi саду лiчылi, што яна самая найшчаслiвейшая iстота на свеце, бо не разумеюць, што вазок, на якiм ездзiць Прынцэса саду – iнвалiдны. У дзяўчынкi, на жаль, няма сяброў, яе не наведваюць былыя аднакласнiкi, яна знайшла паразуменне толькi з насельнiкамi саду. Пасябравала з iмi настолькi, што стала разумець iх мову. | бел. | 8,00 | 100 | 7Б/ малюнкi | |
| 52 | **Бучынская Н. Байкi са смаўжынай хаткi.** Казкi. 5 арк.<br>“Байкi са смаўжынай хаткi” – гэта тры займальныя i пазнавальныя гiсторыi. У казцы “Смоўжык iграе на скрыпачцы” аўтар прапануе чытачам асвоiць спосаб мяняцца ў памерах, паслухаць канцэрт жамязы, самiм прыдумаць развiццё некаторых падзей цi прычыны паводзiн асобных герояў: смоўжыкаў, камароў-крывасмокаў, вялiкiх мух, павучкоў. Амаль дэтэктыўная гiсторыя “Абрабавалi цётачку Смаўжыху!” дае магчымасць зазiрнуць глыбей у свет насякомых, пацiкавiцца iх асаблiвасцямi i звычкамi, а таксама раскрыць здарэнне з прапажай смаўжынай хаткi. А яшчэ можна вывучыць i праспяваць на свой матыў “Баладу…”, што была складзеная конiкамi адмыслова для ўвекавечання гэтай незвычайнай падзеi. I напрыканцы “Смоўжык уцякае ад Гурмана” – аповед не для слабанервовых! Чытачоў чакае знаёмства з падарожна-пазнавальнай гiсторыяй пра галоднага Гурмана i вёрткага Смоўжыка. Вы зможаце паназiраць за пагоняй i ўцёкамi i нават пабiцца аб заклад, хто выйдзе пераможцам. | бел. | 16,00 | 110 | 7Б/ малюнкi | |
| 53 | **Васючэнка П. В. Таямнiчы куфэрак: казачны серыял.** 10 арк. Ото ж былi паны дык паны! На ўвесь свет праславiлiся яны сваiмi авантурамi: мылам гандлявалi, яйка з-пад Куры-Шчабятуры наседжвалi, на вайну з каралём Гарбузом хадзiлi, з паганым Цмокам змагалiся… Была ў iх служка Дзеўка Дрыпа, ды знiкла, бо пайшла замуж за цара Максiмiляна… Лятучая Свiнка прыносiць iм незвычайную вестку ад Дзеўкi Дрыпы… А новыя прыгоды ў iх жыццё прыносiць куфэрак, пакiнуты невядомым госцем. У кнiзе сабраныя ўсе гiсторыi пра паноў Кублiцкага ды Заблоцкага, у тым лiку новы казачны раман “Таямнiчы куфэрак”. Казкi споўнены прыгодамi, гумарам, незвычайнымi | бел. | 22,00 | 320 | 7Б/ малюнкi | |

| | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|
| | пераўтварэннямі. | | | | | |
| 54 | **Дзіцячы атлас Беларусі. Жывёлы.** Нарысы. 5 арк. | бел. | 10,00 | 64 | мяк. вокл./ малюнкі | |
| 55 | **Карэнда І. На загадкі ёсць адгадкі.** 2 арк.<br>Аўтар прапануе маленькім чытачам правесці з ім вольны час і адгадаць вершаваныя загадкі пра навакольны свет: пра звяроў, птушак і насякомых, пра хатніх жывёл, прыродныя з'явы і расліны. | бел. | 7,00 | 48 | мяк. вокл./ малюнкі | 0 |
| 56 | **Мятліцкі М. Сарока з праспекта.** Вершы і казкі. 5 арк.<br>Пра цікавыя прыгоды расказвае незвычайная сарока-гараджанка, якая гняздуе на мінскім праспекце ў кроне каштана ля станцыі метро «Усход». Да яе стракатлівага аповеду далучаюць свае назіранні і гісторыі іншыя героі. | бел. | 11,00 | 96 | 7Б/ малюнкі | |
| 57 | **Пазнякоў М. Радзіма наша — Беларусь.** Вершы, каламбуры, лічылкі, смяшынкі, скорагаворкі, загадкі. Для дзяцей малодшага і сярэдняга школьнага ўзросту. 5 арк. | бел. | 10,00 | 96 | 7Б/ малюнкі | |
| 58 | **Помоз – Лайкова М. Лунная сказка.**<br>Стихи и сказки**.** 3 л**.** | рус. | 7,00 | 64 | мягкая обл./ил. | |
| 59 | **Тулупова И. 33 улыбки Плаксильяны.** 3 л.<br>Воспитанная принцессой, девочка часто плачет и капризничает, но с памощью старшего друга Дзьмухавея быстро взрослеет и понимает, что шантажировать родителей слезами совсем необязательно. Можно просто каждый день делать что-то полезное. | рус. | 7,00 | 64 | мягкая обл./ил. | |
| 60 | **Юркин И. Амиго, Ника и другие.** Рассказы для детей**.** . 5 л. В книге Ивана Юркина, уже четвертой по счету, нет вымышленных персонажей или придуманных историй. Автор знакомит нас с девочками и мальчиками, которые не "понарошку", а на самом деле попадают в разные, порой драматические или очень забавные, ситуации. Как это часто случается в жизни, ребята могут и поспорить с друзьями, и вдруг поссориться, но всё заканчивается примирением. | рус. | 12,00 | 110 | 7Б/ иллюстр. | |
| ***Серыя "Казкі XXI стагоддзя"*** | | | | | | |
| 61 | **Пшонік Г. Бліскучая краіна.** Казкі . 7 арк.<br>Аўтар кнігі "Бліскучая краіна" шчыра верыць у востры розум і душэўную чуйнасць сучаснага чалавека 7 – 12-гадовага ўзросту. А таму смела выпраўляе чытача ў небяспечныя падарожжы па трох узроўнях відэагульні-пасткі, на спакуслівую і рызыкоўную выспу забаў, ахвотна раскрывае – з дапамогай штукара Нікадзіма і Рудога ката – сакрэты, як зрабіць уласнае жыццё пераможным і цікавым. Аўтар вельмі спадзяецца, што досвед герояў яго кнігі дапаможа хлопчыкам і дзяўчынкам лягчэй вырашаць няпростае пытанне "Крыўдаваць або даваць?" , вырасціць самастойна "Крышталікі радасці" і наагул стацца крыху больш назіральнымі, вясёлымі і шчаслівымі. | бел. | 10,00 | 130 | мяк. вокл./ малюнкі | |
| ***Серыя* "100 пытанняў пра Беларусь" (збяры калекцыю кніг!)"**<br>*Новая выдавецкая серыя, адрасаваная малодшым школьнікам. У 2020 годзе выйдуць першыя 5 кніг серыі.* | | | | | | |
| 62 | **10 пытанняў пра беларусаў.** 5 арк.<br>Якія старажытныя плямёны насялялі тэрыторыю сучаснай Беларусі? Як раней называлі беларусаў? Як мянялася мода на адзенне ў нашых далёкіх продкаў? У якія прымхі і забабоны верылі нашы продкі? Якія народныя традыцыі існуюць у беларусаў? Якія традыцыйныя стравы былі на стале ў нашых продкаў? Калі ўзнікла беларуская мова? Якія народнасці пражываюць на тэрыторыі сучаснай Беларусі?<br>На гэтыя і іншыя пытанні можна знайсці адказы ў кнізе. Апроч таго, шмат карыснай інфармацыі пра звяроў можна прачытаць у рубрыцы "Цікавыя факты". | бел. | 6,00 | 48 | мяк. вокл./ малюнкі | |
| 63 | **10 пытанняў пра нашых славутых гістарычных асоб.** 5 арк.<br>Якога беларускага князя называлі чараўніком? Хто быў першым беларускім асветнікам? Чым праславілася Еўфрасіння Полацкая? Чаму Кірылу Тураўскага называлі "беларускім залатасловам"? Чаму Францыск Скарына сваю кнігу выдаў у Празе, а не на сваёй радзіме? На гэтыя і іншыя пытанні можна знайсці адказы ў кнізе. Апроч таго, шмат карыснай інфармацыі пра звяроў можна прачытаць у рубрыцы "Цікавыя факты".. | бел. | 6,00 | 48 | мяк. вокл./ малюнкі | |
| 64 | **10 пытанняў пра беларускія гарады і вёскі.** 5 арк.<br>Які горад называюць "бацькам беларускіх garадоў"? Якое насельніцтва мелі першыя беларускія гарады? Як выглядалі беларускія хаты ў далёкай старажытнасці? Як нашы далёкія продкі абыходзіліся без гадзіннікаў, халадзільнікаў і аўтамабіляў? | бел. | 6,00 | 48 | мяк. вокл./ малюнкі | |

| | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|
| | На гэтыя і іншыя пытанні можна знайсці адказы ў кнізе. Апроч таго, шмат карыснай інфармацыі пра звяроў можна прачытаць у рубрыцы “Цікавыя факты”. | | | | | |
| 65 | **10 пытанняў пра беларускія рэкі і азёры.** 5 арк.<br>Чаму даўней казалі, што ў Дзвіны залатое дно і срэбныя берагі? Якая знакамітая бітва адбылася на рацэ Нямізе? На якой рацэ было разгромлена войска Напалеона? Якое беларускае возера самае глыбокае?<br>На гэтыя і іншыя пытанні можна знайсці адказы ў кнізе. Апроч таго, шмат карыснай інфармацыі пра звяроў можна прачытаць у рубрыцы “Цікавыя факты”. | бел. | 6,00 | 48 | мяк. вокл./ малюнкі | |
| 66 | **10 пытанняў пра звяроў.** 5 арк.<br>Якія вымерлыя звяры калісьці засялялі тэрыторыю Беларусі? Якія звяры, што сустракаюцца ў Беларусі, самыя хуткія? Ці праўда, што звяры бачаць свет не такім, якім бачым яго мы? Ці адчуваць звяры смак ежы так, як адчуваюць людзі? Якія павер’і нашых далёкіх продкаў звязаны са звярамі? Якія звяры занесены ў Чырвоную кнігу Беларусі?<br>На гэтыя і іншыя пытанні можна знайсці адказы ў кнізе. Апроч таго, шмат карыснай інфармацыі пра звяроў можна прачытаць у рубрыцы “Цікавыя факты”. | бел. | 6,00 | 48 | мяк. вокл./ малюнкі | |
| | ***Да “Года малой Радзімы”***<br>*2018-2020 гады ў нашай краіне аб’яўлены “Годам малой Радзімы”.*<br>*Выдавецтвам рыхтуюцца да друку тэматычныя зборнікі, якія дапамогуць бацькам, настаўнікам і вучням, а таксама ўсім, хто цікавіцца гісторыяй і культурай нашай краіны, паглыблыбіць веды пра Беларусь.* | | | | | |
| | ***Серыя “Нашы сімвалы”*** | | | | | |
| 67 | **Васілёк і валошка**. Зборнік вершаў, казак, апавяданняў**.** 6 арк. | бел. | 5,00 | 64 | мягк. вокл./ малюнкі | |
| 68 | **Буслава айчына.** Зборнік вершаў, казак, апавяданняў. 6 арк. | бел. | 5,00 | 64 | мягк. вокл./ малюнкі | |
| 69 | **Зубры – гаспадары.** Зборнік вершаў, казак і апавяданняў. 6 арк. | бел. | 5,00 | 64 | мягк. вокл./ малюнкі | |
| 70 | **Бульбінка.** Зборнік вершаў, казак і апавяданняў 6 арк. | бел. | 5,00 | 64 | мягк. вокл./ малюнкі | |
| 71 | **Лён-лянок.** Зборнік вершаў, казак, апавяданняў 6 арк. | бел. | 5,00 | 64 | мягк. вокл./ малюнкі | |
| 72 | **Шыпшынавыя пацеркі.** Зборнік вершаў, казак, апавяданняў. 6 арк. | бел. | 5,00 | 64 | мягк. вокл./ малюнкі | |
| | ***Серыя “Жывая класіка дзецям”*** | | | | | |
| 73 | **Барадулін Р.** У кнігу ўвайшлі лепшыя вершы паэта, адрасаваныя дзецям. 2 арк. | бел. | 4,00 | 24 | мягк. вокл./ малюнкі | |
| 74 | **Пысін А.** У кнігу ўвайшлі лепшыя вершы паэта, адрасаваныя дзецям. 2 арк. | бел. | 4,00 | 24 | мягк. вокл./ малюнкі | |
| 75 | **Пісьмянкоў А.** У кнігу ўвайшлі лепшыя вершы паэта, адрасаваныя дзецям. 2 арк. | бел. | 4,00 | 24 | мягк. вокл./ малюнкі | |
| 76 | **Навуменка І. Ваяўнічы вожык.** Апавяданні. 5,5 арк.<br>Ці можна навучыць сабаку чытаць, хто можа скрасці гадзіннік, чаму вожык ваяўнічы, як кот Мікіта выратаваў свайго маленькага гаспадара ад шалёнага сабакі? Адказы на гэтыя ды іншыя пытанні ў цудоўных апавяданнях народнага пісьменніка Беларусі Івана Навуменкі (1925 — 2007). | бел. | 6,00 | 64 | мяк. вокл./ малюнкі | |
| | ***Серыя “Я люблю чытаць”:***<br>*лепшыя творы беларускай і сусветнай літаратуры для малодшых школьнікаў* | | | | | |
| 77 | **Пальчэўскі А. Рэкс і Казбек. Крыўда. Аднавокі сом. Як мядзведзь рыбу лавіў**. Апавяданні. 5 арк. | бел. | 8,00 | 96 | 7Б/ малюнкі | |
| 78 | **Хомчанка В. Галка. Нег. Гузік. Самы лепшы малюнак. Апельсін. Мама. Коска. Дзядоўнік.** Апавяданні. 5 арк. | бел. | 8,00 | 96 | 7Б/ малюнкі | |
| | **ПЕРАКЛАДЫ** | | | | | |
| 79 | **Далягляды, 2020. Альманах.** Прадстаўлена літаратура Еўропы, Азіі і Амерыкі. 15 арк. | бел. | 20,00 | 300 | мягк. вокл./ без іл. | |
| 80 | **Груэл Д. Гісторыі шытай лялькі Рэгэдзі Эн.** | бел. | 15,00 | 200 | мягк. вокл./ | |

| | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|
| | Пераклад з англійскай мовы Мар'яна Вітэра.10 арк.<br>Аднойчы дзяўчынка Марсэла знайшла на гарышчы бабулінага дома старую шытую ляльку. Тую самую даражэнькую Рэгэдзі Эн, панабіваную бавоўнай, якую так любіла ейная бабуля.<br>Вядома, лялька адразу становіцца Марсэлінай улюбёнкай. Колькі ж прыгодаў выпадае на долю дзівоснай Рэгэдзі! У дзіцячай яна хутка робіцца лідарам сярод усіх лялек, выратоўвае сабаку Файда, выпраўляецца ў вымушаны палёт на паветраным змеі і дапамагае тым, хто мае ў гэтым патрэбу. Дый чаго толькі не здараецца з шытай лялькай, на вуснах якой — заўсёдная добрая ўсмешка.<br>Напісаная ў 1918 годзе амерыканскім пісьменнікам і мастаком Джоні Груэлам, кніга сталася класічным творам літаратуры для дзяцей. Чытаць яе захапляльна і прыемна як дзецям, гэтак і дарослым. | | | | без іл. | |
| 81 | **Шолам-Алейхем. Хлопчык Мотл.** Аповесць. Пераклад Алены Васілевіч. 8 арк.<br>Аповесць класіка яўрэйскай літаратуры Шолам-Алейхема (1859-1916), аднаго з пачынальнікаў літаратуры на ідыш, у тым ліку дзіцячай, -- гэта гісторыя сям'і з мястэчка, якая ў пошуках лепшага пераязджае ў Амерыку. Твор прасякнуты паэзіяй жыцця і своеасаблівым сумным гумарам. | бел. | 12,00 | 160 | мягк. вокл./ без іл. | |
| 82 | **Вісліцкі Я. Пруская вайна**. Пераклад з лацінскай мовы Ж. Некрашэвіч-Кароткай. Мастак М. Купава 10 арк.<br>«Пруская вайна» (лац.: Bellum Prutenum) — эпічная гістарычная паэма, напісаная ў 1515 годзе Янам Вісліцкім. Упершыню выдадзена ў 1516 годзе кракаўскім друкарскім дваром Яна Галера. У паэме услаўляецца перамога над крыжакамі, здабытая як народнае змаганне. Твор вызначаецца манументальнасцю батальных сцэн, пластычнасцю вобразаў прыроды. Паэма стаіць каля вытокаў жанру эпапеі ў беларускай, польскай і літоўскай літаратурах.<br>Ян Вісліцкі стаў пачынальнікам свецкай плыні ў эпічнай паэзіі Польшчы, Літвы і Беларусі, прыбранай у антычныя строі — класічную латынь. Вялікую гістарычную падзею, рыцарскія подзвігі Ягайлы і Вітаўта паэт падсвяціў святлом любові да сваёй радзімы. Вопыт Яна Вісліцкага, верагодна, выкарыстаў аўтар ліра-эпічнай паэмы «Песня пра зубра» (1522) Мікола Гусоўскі. | бел. | 18,00 | 200 | мягк. вокл./ без іл. | |
| | ***Серия "Белорусская проза"***<br>*Новая издательская серия предлагает читателям лучшие произведения классической и современной белорусской литературы в переводе на русский язык* | | | | | |
| 83 | **Ян Скрыган. Избранное.**<br>Перевод И. Конанец. 20 л. | рус. | 43,00 | 430 | 7Б/ без ил. | |
| | **Публіцыстыка** | | | | | |
| 84 | **Букчын С. Народ издревле нам родной.** Русские писатели и Беларусь. Очерки. Илюстрации. 50 л. | рус. | 55,00 | 960 | 7Б/ без ил. | |